# ВОДЗЫЎ

навуковага кіраўніка па дысертацыі Носік Алесі Анатольеўны «Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Дысертацыя А.А. Носік носіць характар завершанага, комплекснага, аргументаванага даследавання важнай лінгвістычнай праблемы. Намінацыі з эмацыянальным значэннем характарызуюць псіхаэмацыйную сферу індывіда, і вывучэнне іх у святле антропацэнтрычнай канцэпцыі мовы з'яўляецца актуальным. Актуальнасць дысертацыі А.А. Носік абумоўлена, з аднаго боку, важнай роляй эмоцый у жыцці сучаснага чалавека як феномена, які вызначае нацыянальную спецыфіку грамадства і, з другога боку, неабходнасцю адлюстравання эмоцый і эмацыянальных станаў у мове, паколькі менавіта ў мове адлюстроўваецца менталітэт носьбітаў мовы.

Актуальнасць работы вызначаецца складанай прыродай пачуццяў і эмоцый, неабходнасцю вырашэння пытанняў замацавання эмацыянальных уласцівасцей за рознымі сегментамі аб'ектыўнай рэчаіснасці, а таксама выяўлення спецыфікі іх рэпрэзентацыі ў розных сэнсава-тэматычных кантынуумах. Неабходнасць лінгвістычнага аналізу сродкаў, якія адлюстроўваюць эмоцыі чалавека ў мове, матывуецца нераспрацаванасцю праблемы, нявырашанасю пытанняў, звязаных з выпрацоўкай адзінага падыхода класіфікацыі эмацыянальнай лексікі, адсутнасцю работ па функцыянаванні моўных адзінак у розных тыпах дыскурса. Даследаванні прыватных пытанняў вербалізацыі розных аспектаў эмацыянальных станаў і адчуванняў А.В. Доўгаль, А. Ю. Яніцкай, І.Г. Доды, В.Ю. Шыманскай, Ю.В. Маліцкага, І. У. Кандраценя не вырашаюць ў пэўнай ступені акрэсленую праблему. Таму дысертацыя А.А. Носік з'яўляецца запатрабаванай у сучаснай лінгвістычнай навуцы і запаўняе пэўны прабел рэпрэзентацыі ўнутранага стану чалавека ў беларускай мове.

Да ліку асноўных задач работы адносяцца вызначэнне асаблівасцей субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных эмацыянальных намінацый, правядзенне класіфікацыі негатыўных эмацыянальных намінацый з інварыянтнымі значэннямі гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, віны, сораму, страху, а таксама пазітыўных эмоцый радасці, цікавасці і здзіўлення, устанаўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі і выяўленых семантычных мадэлей у корпусе эмацыянальных намінацый. У адпаведнасці з мэтай і задачамі даследавання структуруецца тэкст дысертацыі, якая традыцыйна складаецца з агульнай характарыстыкі, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў. У першай главе разглядаюцца тэрэтычныя пытанні, звязаныя з катэгорыяй эмацыянальнасці, аналізуюцца даследаванні моўнай рэпрэзентацыі эмоцый у розных мовах, а таксама невербальныя сродкі

выражэння і распазнавання эмацыянальных станаў. Другая глава (найбольш аб'ёмная) прысвечана лексічным сродкам намінацый адмоўных эмоцый, якія выяўляюцца ў сэнсавых структурах каля 900 намінацый. Увага даследчыцы канцэнтруецца на найбольш распаўсюджаных намінацыях з інварыянтнымі значэннямі гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, віны, сораму, страху ў іх узаемадзеянні з сумежнымі паняційнымі сферамі. У трэцяй главе разглядаюцца лексічныя сродкі намінацый станоўчых эмоцый.

Навізна даследавання заключаецца ў тым, што на аснове значнага па аб'ёме рэпрэзентатыўнага фактычнага матэрыялу праведзены комплексны аналіз намінацый ўнутранага стану чалавека, выяўлена спецыфіка рэпрэзентацыі эмацыянальнасці ў субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных лексічных адзінках, акрэслены класіфікацыйныя тыпы пеяратыўных, і меліяратыўных найменняў пачуццёва-псіхічнай сферы. Новым з'яўляецца ўклад у тэорыю і практыку лексікаграфіі, распрацоўка метадалагічных прынцыпаў апісання дэфініцый слоўнікавых артыкулаў і стварэнне першага ў лексікаграфічнай практыцы «Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека». Упершыню праведзена найбольш поўная класіфікацыя другасных эмацыянальных ЛСВ у напрамку ад сферы-донара да сферы-рэцыпіента, устаноўлены найбольш прадстаўнічыя зыходныя лексіка-тэматычныя групы, уключаныя ў працэс метафарызацыі (найменні фізічных працэсаў, звязаных з агнём, гарэннем, полымем, вылучэннем высокай тэмпературы, а таксама з воднай стыхіяй, метэаралагічнымі з'явамі вялікай разбуральнай сілы, кулінарна-гастранамічнымі, смакавымі адчуваннямі і інш.).

Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры чытанні курса беларускай мовы, распрацоўцы лекцый, практычных заняткаў і спецкурсаў па лексікалогіі, лексікаграфіі, семасіялогіі, дэрываталогіі і лінгвакультуралогіі, а таксама пры напісанні дыпломных і магістарскіх работ. Практычная значнасць вынікаў даследавання вызначаецца магчымасцю іх выкарыстання ў лексікаграфічнай практыцы.

Саіскальнік А.А. Носік вядзе плённую публікацыйную дзейнасць. Вынікі даследавання адлюстраваны ў 22 работах, у тым ліку ў 5 артыкулах у часопісах, уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйнага даследавання, 7 артыкулах у зборніках навуковых прац, 10 публікацыях у зборніках матэрыялаў канферэнцый.

Высокая якасць працы шмат у чым абумоўлена асобай саіскальніка. У перыяд работы над дысертацыяй А.А. Носік зарэкамендавала сябе як граматны, мэтанакіраваны навуковец, які ўмее сфармуляваць канкрэтныя задачы і вызначаць аптымальныя спосабы іх рашэння, весці самастойны пошук, паслядоўна аналізаваць матэрыял, працаваць з навуковай літаратурай і выходзіць на ўзровень тэарэтычных абагульненняў.

А.А. Носік умее эфектыўна планаваць і арганізоўваць сваю работу. Заняткі па беларускай мове праводзіць на высокім навукова-метадычным

узроўні з выкарыстаннем перадавога педагагічнага вопыту, сучасных інавацыйна-адукацыйных тэхналогій. Яна прымае ўдзел у сацыяльна-грамадскім жыцці калектыва, з'яўляецца адным з арганізатараў шматлікіх мерапрыемстваў, удзельнічае ў падрыхтоўцы студэнтаў да рэспубліканскіх конкурсаў творчых работ. З'яўляецца загадчыкам секцыі беларускай мовы ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце.

Падрыхтаваная дысертацыя А.А. Носік «Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне» з'яўляецца поўнасцю завершанай навукова-даследчай работай і адпавядае ўстаноўленым патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да такіх работ. Навуковая і навукова-педагагічная дзейнасць А.А. Носік дазваляе прысудзіць ёй вучоную ступень кандыдата філалагічных навук за новыя навукова абгрунтаваныя вынікі, выкарыстанне якіх будзе садзейнічаць далейшай распрацоўцы тэарэтычных і практычных пытанняў лексікалогіі, семасіялогіі, лексікаграфіі, семантычнай дэрывацыі:

- выяўленне найбольш поўнага корпуса намінацый эмацыянальнай сферы чалавека (звыш 1100 лексічных адзінак), распрацоўку метадалагічных прынцыпаў апісання дэфініцый слоўнікавых артыкулаў і стварэнне першага ў лексікаграфічнай практыцы «Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека»;
- класіфікацыю эмацыянальных найменняў паводле іх прыналежнасці да пейратыўнай (лексічныя адзінкі са значэннем гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, віны, сораму, страху) і меліяратыўнай (лексічныя адзінкі са значэннем радасці, цікавасці і здзіўлення) разнавіднасцей канатацыі;
- акрэсленне міжчасцінамоўнага семантычнага поля, у склад якога ўключаюцца дзеяслоўныя, субстантыўныя і ад'ектыўныя эмацыянальныя намінацыі, проціпастаўленыя па іх колькасных паказчыках, спецыфіцы функцыянавання ў розных дыскурсах, а таксама ступені выяўлення прымет акцыянальнасці, прадметнасці і кваліфікатыўнасці;
- выяўленне семантычнага сінкрэтызму як фактару сэнсавай трансфармацыі лексічных адзінак у плане іх дыфузнасці, поўнага ці частковага сумяшчэнне прымет ці іх дыферэнцыяцыі, развіцці энантыясемічных эмацыянальных кампанентаў са станоўчай і адмоўнай канатацыяй;
- устанаўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі і асноўных семантычных мадэлей, у аснову якіх пакладзены прынцып суаднесенасці зыходнага і вытворнага лексіка-семантычных варыянтаў.

Навуковы кіраўнік
доктар філалагічных навук,
прафесар В. Д. Старычонак

29 красавіка 2024 г.